Ушацкая раённая біблятэка імя Е.Я.Лось

**Тамара Барадзёнак**

# З ВЫТОКАЎ МАТЫРЫНСКАЙ СПАДЧЫНЫ

200[illegible] г.



***Мой верш ад бароў духмяных,***

***Ад зорнага неба ў жніўні,***

***Ад соку ігруш крамяных,***

***Ад плёскату хваль Умільна.***

***Мой верш – ад кастроў Купалля,***

***Ад сполаху ўночы зарніцаў,***

***Ад рук, што мяне ўзгадавалі,***

***Ад чыстай вады Альзяніцы,***

***Ад роднае песні матчынай –***

***Як дорага мне гэта спадчына!...***

***Т. Барадзёнак***

*У маляўнічым куточку Ушаччыны, паміж духмяных лясоў і гаманкіх бароў, дзе цячэ сінявокая рэчка Альзяніца, стаіць прыгожая вёсачка Матырына. Добрыя, шчырыя і працавітыя людзі жывуць у ёй. А яшчэ ў Матырыне любяць і ўмеюць спяваць, памятаюць абрады і звычаі, якія перадаюцца з пакалення ў пакаленне, таму і захаваліся да нашых дзён.*

*Цудоўныя старадаўнія народныя і абрадавыя песні спявае народны фальклорны гурт “Матырынская спадчына”, які існуе пры Матырынскім СДК ужо больш пятнадцаці гадоў.*

*Мілагучны спеў “Матырынскай спадчыны” наклаў свій адметны адбітак на творчасць паэтэсы Тамары Барадзёнак, якая нарадзілася ў гэтай вёсцы, там прайшло яе дзяцінства і юнацтва, і якая з маленства захаплялася старадаўнімі песнямі, што гучалі і на вясковых святах, і якія проста спявалі вясковыя жанчыны. Вельмі прыгожа спявала бабуля паэтэсы Аўласенка Марыя Іванаўна, з першага дня існавання гурта “Матырынская спадчына” у ім яе маці Аўласенка Зінаіда Аляксандраўна.*

*Удзельніцы гурта часта запрашаюць Тамару Барадзёнак да сябе на сустрэчы, яны любяць яе творчасць. Гэтыя сустрэчы заўсёды вельмі цёплыя і на іх заўсёды гучаць песні. Менавіта цудоўныя фальклорныя напевы жанчын натхняюць паэтэсу ствараць новыя лірычныя творы.*

*І. Урбан*



***

Ці вяселле ў вёсцы, ці радзіны,
Ці Купалы казачная ноч –
Запяюць вясковыя жанчыны
Так, што слёзы ціха капнуць з воч.

Рок і джаз усё запаланілі,
Лямант дзікі а ніяк не спеў.
Пра сваё ж пра роднае забылі,
Як слухач душою абяднеў!...

Чым з замежжа слухаць песні зброду,
Свій фальклор паслухайце спярша:
Гэта ў ім жыве душа народа –
Беларусі светлая душа.

## Да 15-годдзя Матырынскага народнага фальклорнага гурта “Матырынская спадчына” на Ушаччыне

Вясна ўжо весці рэй бярэцца,
Звініць жаўрук – цяплу ён рад,
І сонца радасна смяецца –
Усё, як пятнаццаць год назад…

Не многа гэта і не мала,
Але ў такую вось пару
Любоў да песні вас сабрала,
Узляцела песня ўгару.

Спачатку ціхенька лунала,
Ды ў душы людзям шлях знайшла.
Пасля ў раёне загучала,
Пазней да вобласці дайшла.

Ва ўсёй рэспубліцы пачулі
Матырынскі ваш шчыры спеў.
Ён – мілагучны і прачулы –
Старонку нашу абляцеў.

Пяюць цудоўныя жанчыны
З адкрытай шчодраю душой,
Напэўна, з гэтае прычыны
Ад песні хораша такой.

Шмат песень ёсць у вас цудоўных
Ад нашых родных каранёў.
Пяшчота сэрцы людзям поўніць
Ад вашых спеваў зноў і зноў.

Жыццё нялёгкае пражыўшы,
Адпрацаваўшы многа год,
Ды аптымізму не згубіўшы,
Прыйшлі вы сёння ў карагод.

Ад сумных песень сэрца плача,
Гучаць прыпеўкі – шчыры смех…
Паклон жа вам, жанчынкі нашы,
Здароўя, шчасця і ўцех!…


усіх

## Жывіце, традыцыі Ушаччыны!

Наша непаўторная Ушаччына;
Родны край бароў, лясоў, азёр,
Нас з маленства песціць ласкай матчынай,
Промнем сонца, казкай летніх зор.

Тут у нас на таленты багаты,
Маюць іх і горад, і сяло.
І няма ніводнай, пэўна, хаты,
Дзе б традыцый даўніх не было.

На Купалле ўюць вянкі красуні,
На ваду бягучую нясуць,
А бабулькі – нашыя пявунні
Гэдак песні хораша пяюць!

Тут вясеньку раннюю гукаюць,
А на Юр’я ходзяць на расу,
Скачуць там, частуюцца, спяваюць,
Праганяюць людзі з сэрца сум.

Велікодным яйкам фарбаваным
Пачастуюць госця ў Вялікдзень,
Гурт зімою з зоркаю каляднай
І з “казой” спявае для людзей.

Могілкі старанна падмятаюць
Радаўніцай светлаю вясной,
Са слязой памерлых памінаюць
Чаркай, клёцкай, поліўкай, куццёй.

Жэняць хлопца пекнага Цярэшку,
Смех звініць, мароз злуе-трашчыць,
А дзяўчаты шчоўкаюць арэшкі,
Ладзяцца ў Хрышчэнне варажыць.

З нецярпеннем дня таго чакаюць,
Шэпчуцца, загадкава маўчаць,
А бабулькі ўнучак навучаюць,
Як свій лёс убачыць-распазнаць.

Прыгажэй, каб і хацеў, не стрэш,
Звычаяў, традыцый і гуртоў,
І душой, і сэрцам маладзееш,
Да жыццёвых цяжкасцей гатоў.

Родны край – край рэчак хуткацечных,
Край традыцый родных і людзей,
Майскім садам ты красуйся вечна,
Ды пад зоркай шчасця і надзей!

## Шчодры вечар

З кожнага коміна цягнецца ў неба
Дым над ахутаным змрокам сялом.
Ладны марозік, бярэцца, як трэба,
Стукае-грукае кіем-жазлом.

Выйдзеш на вуліцу: ціха, марозна,
Свецяцца яркія ў вокнах агні,
У іней прыбраны да свята бярозы,
Месяц прыветна глядзіць з вышыні.

Гурт калядоўшчыкаў з хаты да хаты
Пойдзе вось-вось ужо калядаваць:
Песняй-калядкай людзей услаўляць,
Людзі ж за гэта – частункі даваць.

Што ж гэта нешта не бачна дзяўчатак,
Калядаваць з іх ніхто не бяжыць?
Сёння ў іх ёсць больш цікавы занятак –
Маюцца сёння яны варажыць.

Нават і сталы не ўседзіць у хаце,
Што тут казаць ужо пра малышоў!
Будуць да позняга калядаваці –
Вечар жа шчодрык чаканы прыйшоў.

## Дажынкі

Сягоння свята ў вёсцы будзе –
Гармонік чуецца ад рання,
Ідуць у лепшых строях людзі
Усе на дажынкі – на гулянне.

Даецца хлеб цаною працы,
Цаною мазаля і поту.
Яны ж – вяскоўцы – не баяцца
Сялянскай цяжкае работы.

Жніво на славу ўдалося,
А поле зноўку цешыць рунню.
Вянкі камбайнерам з калосся
Сплялі вясковыя красуні.

Частуе свежым караваем
Прысутных стройная дзяўчына,
І песня жніўная лунае –
Так ёсць, было і быць павінна!...



## Жніўная

Пара жаці жыта –
Жыта маладое.
У амбары сыпаць
Зерне залатое.

*Прыпеў:*

Кланяюцца каласы
Ды сярпом сталёвым.
Мёдам пахнуць верасы,
Уражаем новым.

Вецярок люляе
Гоні залатыя,
І спяваюць жнеі –
Жнеі маладыя.

*Прыпеў:*

Вынік цяжкай працы –
Каравай духмяны.
Хлебароб старанны
Ўсюды паважаны.

*Прыпеў:*



***

Песня дзесці чуецца далёкая
І плыве над ціхаю ракой.
З берага дзяўчына яснавокая
На ваду вянок пускае свой.

Кветкі рвала з яркімі галоўкамі,
Каб вяночак потым сабе звіць,
Не пайшла да вогнішча з сяброўкамі,
Да ракі пабегла варажыць.

Хай плыве выночак, не спыняецца,
У той бок, дзе мусіць быці той,
Чые словы ёй не забываюцца,
Праз якога страціла спакой.

Сэрца смуткам і надзеяй поўніцца,
А вяночак па вадзе плыве.
Хай, што загадала, тое споўніцца
Ночкаю купальскай у яе.



## Песня купальская

Не рызыкнуў нават дождж з аблачыны
У вечар святочны ні кроплі праліць,
Бо выйшлі Купалле ўславіць жанчыны,
Песні спяваючы, жытам хадзіць.

Песня плыве па-над полем, ракою,
Рэха разносіць далёка яе.
І пачуццё ўзнікае такое,
Што не жанчыны – зямля ўся пяе.

Вогнішча весела ў неба шугае,
Скачуць гарэзы-хлопцы праз агонь,
А песня гучыць то мацней, то сціхае,
Радасцю светлаю, ціхай журбою.

І ўсё забываецца: поспех, наўдача,
Як гукі яе ў наваколлі плывуць,
І сэрца шчыміць, і душа мая плача –
Купальскую песню жанчыны пяюць.

## Траецкая субота

Сёння клопатаў багата,
Пачаліся яны з ранку –
Чысцінёю ззяе хата
І падсінены фіранкі.

Круг з аеру на падлозе
Ўжо дачушка выкладае
А сынок галлё бярозкі
Наламаць пабег да гаю.

За іконкаю, на вокнах
“Май” стаяць духмяны будзе –
У траецкую суботу
Так здаўна рабілі людзі…

Лазня паліцца пад вечар –
Лёгкі пар, пахучы венік.
Заўтра тройца – ставім свечкі
І наведваем памерлых.

На абрусе даматканым,
Што на могілках рассцелем,
Памянём тых, хто не з намі,
Са слязоюгоркім зеллем.

Ім даўно не трэба хаты –
Хата ім – зямля сырая…
Чорны помнік… любы тата,
Як цябе мне не хапае!...





Літаратура:

1. Барадзёнак Т.Д. “А я люблю…” – Полацк: “Спадчына Ф. Скарына”, 1996. – с. 31, 49, 63.
2. Барадзёнак Т.Д. “Лунай песня” – Ушачы, 2006. с. 22.
3. Барадзёнак Т.Д. “Мой верасень” – 2004. – с. 9, 14, 16.
4. Козенка М.А. “Традыцыйныя культура і дзеці” – Мінск: БелДІПК, 2004. – с. 238.

Рэдактар і кампьютарны дызайн: Кашненка Г.М.

